**Гоўзіч І.М.**

## Графічныя формы верша

**Графічныя формы верша** — упарадкаванне і размяшчэнне вершаваных радкоў паэтычнага твора пры іх напісанні або ў друкаваным выглядзе. Традыцыйным з’яўляецца друкаванне (напісанне) паэтычных радкоў у слупок па строфах з прабеламі паміж строфамі. З мэтай узмацнення сэнсавага або інтанацыйнага ўздзеяння строфы (радкі) могуць размяшчацца злева ці справа. Найбольш распаўсюджаным графічным прыёмам з’яўляецца лесвіца — падзел радкоў на міні-радкі ці асобныя словы. У нацыянальнай літаратуры графічныя формы верша ў выглядзе лесвіцы сустракаюцца ў паэзіі П. Панчанкі, Р. Барадуліна, А. Вярцінскага, Я. Сіпакова, В. Зуёнка. а таксама ў творчасці паэтаў-постмадэрністаў В. Жыбуля, С. Мінскевіча, Зм. Вішнёва і інш.

Адрозніваюцца ад агульнапрынятых графічных форм верша і “фігурныя вершы”, радкі якіх утвараюць пэўную фігуру ці выяву (трохкутнік, ромб, квадрат, крыж, сэрца, зорка і інш.). Падобныя формы сустракаюцца ў творчасці С. Полацкага. Напрыклад, у “Рыфмалагіёне” сустракаюцца вершы, аформленыя ў форме сэрца (“Орёл российский”), васьміканцовай зоркі (“Благоприятствование цару...”), радыяльнага квадрата з пачатковай літарай “Ц” у сярэдзіне (“Царствуй многа лета”). У сучаснай літаратуры фігурныя вершы сустракаюцца ў дзіцячай паэзіі і ў творчасці С. Мінскевіча (“Хто як малюе (крата-квадратны трыпціх)”, “Праз двайное шкло”).

### Літаратура

Литературный энциклопедический словарь. — М., 1987.

Мінскевіч, С. Я з Бум-Бам-Літа / С. Мінскевіч. — Мінск, 2008.

Рагойша, В.П. Паэтычны слоўнік / В.П. Рагойша. — 3-е выд., дапрац. і дапоўн. — Мінск, 2004.